**Назва ТВП:** Бярэзіна-Гайна







© С. Левый

**Код:** BY024

**Геаграфічныя каардынаты:** 54°23' N 28°18' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Мінская вобласць: Барысаўскі раён, Лагойскі раён, Смалявіцкі раён

**Плошча:** 17736 га

**Крытэрыі:** A1

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** не мае

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП міжнароднай значнасці

## Агульнае апісанне:

ТВП уключае ў сябе поўны спектр поймавых біяцэнозаў, характэрных для цэнтральнай часткі Беларусі. Угоддзе размешчана ў поймах рэк Бярэзіна і Гайна ад возера Палік на поўначы да ўпадзення ў Гайну ракі Цна на поўдні. Шырыня пойм рэк складае 1,5-3 км. У поймах пераважаюць нізінныя купіністыя асаковыя балоты і забалочаныя лугі, месцамі моцна парослыя хмызнякамі. Па краях пойм на слаба выяўленых поймавых тэрасах растуць забалочаныя лясы, у асноўным ольсы і ельнікі. Невялікую плошчу ў басейне ракі Гайна займаюць пераходныя сфагнавыя

балоты.

Працягласць ракі Бярэзіна ў межах угоддзя складае 12 км, ракі Гайна – 24 км. Гідралагічны рэжым рэк характрызуецца высокай непрацяглай веснавой паводкай і нізкай летняй межанню. У паводку пойма затапляецца на перыяд ад 10-20 сутак да 1,5-2 месяцаў, вышыня паводкі вар’іруе ад 0,5 да 2 м. Рэчышчы звілістыя, на Бярэзіне са шматлікімі старыцамі.

Угоддзе характарызуецца нізкім узроўнем гаспадарчага выкарыстоўвання. Поймавыя лугі Бярэзіны часткова выкошваюцца. У пойме Гайны сенакашэнне вядзецца пераважна ў месцы яе ўпадзення ў Бярэзіну і каля паўднёвых межаў ТВП. На ўзвышшах у пойме Бярэзіны пасецца жывёла. Тут жа знаходзіцца шэраг невялікіх тарфянікаў, але іх распрацоўка не вядзецца.

Практычна ўся тэрыторыя выкарыстоўваецца для палявання, а рэкі Бярэзіна, Гайна і шматлікія старычныя азёры – для рыбалкі мясцовымі і прыезджымі рыбаловамі. У межах ТВП знаходзіцца паркава-маёнткавы комплекс «Весялова». Зараз ён выкарыстоўваецца як база адпачынку. Тут жа знаходзіцца пасека і пляцоўка для коннага спорту.

## Асноўныя біятопы:

Шыракалісцева-іглічныя лясы - 60%, хмызнякі – 5%, поймавыя вільготныя лугі – 20%, рэкі і іх узбярэжжа – 4% сельгасугоддзі – 10%, населеныя пункты – 1%.

## Птушкі:

Прыродаахоўная каштоўнасць тэрыторыі вызначаецца, у першую чаргу, гнездаваннем тут глабальна пагражаемых відаў птушак. Тут адзначаны на гнездаванні некалькі такіх відаў птушак: вялікі арлец *Aquilaclanga*, дубальт *Gallinagomedia*, вяртлявая чаротаўка *Acrocephaluspaludicola*, вялікі грыцук *Limosa limosa*. Акрамя таго, угоддзе з'яўляецца важным месцам гнездавання для шэрагу водна-балотных птушак, а ў веснавы перыяд мае выключнае значэнне для адпачынку і кармёжкі мігрыруючых гусей, качак і кулікоў.

## Іншыя групы жывел:

Звяры: буры мядзведзь *Ursusarctos*, еўрапейская рысь *Lynxlynx*, барсук *Meles meles*, стронга ручаёвая *Salmotruttamorphafario*.

Насякомыя: жужаль рашэцісты *Carabuscancellatus*, жужаль фіялетавы *Carabus violaceus*, жужаль шчыгрынавы *Carabuscoriaceus*, бражнік Празерпіна *Proserpinus proserpina*, паўлінава вока малое начное *Eudiapavonia*, мядзведзіца-гаспадыня *Pericalliamatronula*, чмель мохавы *Bombusmuscorum*.

Расліны: баранец звычайны *Huperziaselago*, лілея царскія кучары *Liliummartagon*, чына горная *Lathyrusmontanus*, пылкагалоўнік чырвоны *Cephalantherarubra*, касач сібірскі *Irissybirica*, пальчастакарэннік балтыйскі *Dactylorhizabaltica*, шпажнік чарапіцавы *Gladiolusimbricatus*.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Гусь шэрая *Anser anser* | гн | 0-5 п | 2006-2011 | П | | |
| Качка-шылахвостка *Anas acuta* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Качка-чырка *Anas querquedula* | гн | 250-300 п | 2006-2011 | Э | ↓ | B2 |
| Савук-лутока *Mergus albellus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Савук вялікі *Mergus merganser* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | 5-8 с | 2006-2011 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чапля вялікая белая *Casmerodius albus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Чорны бусел *Ciconia nigra* | гн | 2-4 п | 2006-2011 | Э | ↔ | |
| Каршун чорны *Milvus migrans* | гн | 1-2 п | 2006-2011 | Д | ↔ | |
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | мг | 2-5 ас | 2006-2011 | П | | |
| Арол-вужаед *Circaetus gallicus* | гн | 2-4 п | 2006-2011 | Э | ↔ | |
| Лунь палявы *Circus cyaneus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн | 2-4 п | 2006-2011 | Э | ↔ | |
| Арлец вялікі *Aquila clanga* | гн | 2 п | 2008-2011 | Д | ↔ | A1 |
| Скапа *Pandion haliaetus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Пагоніч звычайны *Porzana porzana* | гн | 250-400 с | 2006-2011 | Э | ↔ | B3 |
| Драч *Crex crex* | гн | 200 с | 2006-2011 | Э | ↔ | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Журавель шэры *Grus grus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Баталён *Philomachus pugnax* | мг | 500-1500 ас | 2006-2011 | П | | |
| Дубальт *Gallinago media* | гн | 15-25 с | 2004 | Э | ↔ | A1 |
| Грыцук вялікі *Limosa limosa* | гн | 15-25 п | 2009 | П | ↔ | A1 |
| Чайка малая *Hydrocoloeus minutus* | гн | 10-20 п | 2007, 2011 | Д | ↓ | B2 |
| Чайка шызая *Larus canus* | мг | + | 2006-2011 | П | | |
| Рыбачка чорная *Chlidonias niger* | гн | 50-100 п | 2006-2011 | Э | ↓ | B2 |
| Чаротаўка вяртлявая *Acrocephalus paludicola* | гн | 3 с | 2006 | Д | ↓ | |
| Чаротаўка вяртлявая *Acrocephalus paludicola* | гн | 0 с | 2007-2010 | Д | ↓ | |

**Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:**

## Пагрозы:

Сістэма гаспадарання, якая гістарычна склалася на гэтай тэрыторыі, у многім вызначыла стан прыродных супольніцтваў. Сенакакшэнне і выпас жывёлы спрыялі захаванню адкрытых участкаў поймы. Змяншэнне сенакосных плошчаў, асабліва заўважнае ў апошнія гады, вядзе да зарастання поймы хмызнякамі, што зніжае плошчу найбольш каштоўных у прыродаахоўным плане поймавых лугоў і балот.

Пажары перыядычна ўзнікаюць у лясах угоддзях, а ў засушлівыя гады і ў пойме. Асноўнымі прычынамі пажараў з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём, а таксама веснавыя палы на лугах, якія праводзяць мясцовыя жыхары.

Пэўную пагрозу ўяўляе дачнае будаўніцтва, якое вядзецца на павышаных участках поймы. У апошнія гады ўзнік невялікі дачны пасёлак у наваколлі вёскі Весялова на правым беразе Бярэзіны.

Адмоўнае ўздзеянне на стан фауны аказваюць незаконныя паляванне і рыбная лоўля, выпадкі якіх здараюцца даволі часта. У выніку браканьерства колькасць асноўных гаспадарча-каштоўных жывёл застаецца значна ніжэй біялагічнай ёмкасці ўгодзя.

## Рэкамендацыі па захаванню:

Для захавання флоры і фауны гэтай тэрыторыі трэба ў межах ТВП стварыць рэспубліканскі заказнік. Гэта дасць магчымасць захаваць экалагічны калідор і месцы гнездавання рэдкіх відаў.

## Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Мангін Э.А., Левы С.В.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Астроўскі А.А., Дамброўскі В.Ч., Максіменкаў М.В., Навіцкі Р.В., Натыканец В.У., Скуратовіч А.М., Юрко В.В.)

Mongin, E. 2008. Great snipe population, habitat management andconservation aspects in Belarus: a review. *In: Economical, social and cultural aspects in biodiversity conservation. Proceedings of the 1st North Vidzeme Biosphere Reserve international scientific conference of 23 November, 2006, Valmiera, Latvia. (eds: Opermanis, O., Whitelaw, G.).*

Press of the University of Latvia. Pp.31-38.

Mongin, E., Bogutski, Y., and N., Cherkas. 2009. Monitoring of the Great Snipe and the Black Grouse in Specially Protected Nature Territories. *In: Sustainable Planning Instruments and Biodiversity Conservation. Proceedings of the 2nd North Vidzeme Biosphere Reserve and Vidzeme University of Applied Sciences International Scientific Conference of 13-14 November, 2008, Valmiera, Latvia. (ed. Livina, A.).* Press of the University of Latvia. Pp.62-72.

**Складальнікі :** Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнэт-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*